УДК 811.161.3’42(043.3) + 821.161.3.09(092)(043.3)

**Паходжанне рэлігійных лексем (на матэрыяле твораў У. Арлова)**

Пятрова Н. Я.
Беларускі нацыянальны тэхнічыны ўніверсітэт

Прыкладамі праславянскіх рэлігіёнімаў з тэкстаў У. Арлова з’яўляюцца словы *бог, вера, Гасподзь, пост, Пярун* і інш.: *І спяшаліся з двух бакоў насустрач ім людзі лацінскае веры і людзі нашай дзедаўскай веры са сваімі мошчамі і харугвамі* [Кроніка Лаўрына Баршчэўскага, с. 18]*.

У тэкстах У. Арлова шырока ўжываюцца рэлігіёнімы, запазычаныя з лацінскай мовы непасрэдна або праз польскую: *алтар, базыльян, ерэтык, езуіт, інквізіцыя, кальвін, касцёл, уніят, францішкан* і інш.: *... заступніца наша Маці Божая заплакала ў сваім алтары буйнымі, як боб, слязамі* [Маналог святога Пётры, с. 5].

Прыкладамі запазычанняў з грэчаскай мовы з’яўляюцца лексемы *апостал, Біблія, д’ябал, Евангелле, епіскап, клірык, манах, царква* і інш.: *Успамінайце настаўнікаў вашых, вучыў апостал Павел ...* [Кроніка Лаўрына Баршчэўскага, с. 19].

Адзінкавыя прыклады найменняў нямецкага паходжання, напрыклад, *атэіст, архібіскуп* (рэлігіёнім *архібіскуп* аўтар ужывае ў варыянце *арцыбіскуп*): *Арцыбіскуп, адрозна ад праваслаўных архірэяў, у тым ліку і сталічных, бездакорна гаворыць па-французску, што яе таксама раздражняе* [Каханак яе вялікасці, с. 153].

Прыкладамі паланізмаў з’яўляюцца словы *анёл, ахвяра, блюзнер, ксёндз* і інш.: *Кажуць, гэты Лышчынскі несамавіты блюзнер і бязбожнік, якіх свет не бачыў, але тое ўжо справа дзесятая* [Місія папскага нунцыя, с. 95].

Сустракаюцца адзінкавыя запазычанні со старажытнаяўрэйскай (*Адам, левіяфан*), мангольскай (*харугва*), арабскай (*Алах, мінарэт*). З уласна-беларускіх рэлігіёнімаў можна прывесці такія словы, як *Вялікдзень, велікодны*: *А на ютрані велікоднае, калі святар абвяшчаць будзе: “Хрыстос уваскрос!”* [Пішу вам у Масковію, с. 46].

Такім чынам, паходжанне рэлігійных лексем традыцыйна звязана з іх семантыкай: звычайна праваслаўны рэлігіёнім мае праславянскае або грэчаскае паходжанне, каталіцкі – лацінскае або польскае.

*Тут і далей прыклады прыводзяцца паводле выдання: Арлоў, У Каханак яе вялікасці: Гістарычныя апавяданні, эсэ / У. Арлоў. – Мн.: І.П. Логвінаў, 2004. – 252 с.